ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO.5 (3221) ● ● ЧАЦВЕР, 10 ЛЮТАГА, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: W.GOLAS.BY



**Згода пачынаецца з сям і**
Стар. 2

**Круг вялікі, круг малы…**
Таленавітыя родзічы і нашчадкі вядомага беларускага кампазітара Мікалая Аладава жывуць у Мінску, Маскве, Санкт-Пецярбургу Стар. 3

**Хто ў цераме жыве?**
На падворку Генадзя Пузанкевіча з Жодзіна цэлы заапарк Стар. 4

ПАДЗЕЯ

# Векавых традыцый абнаўленне

## Першае пасяджэнне Рэспубліканскага савета па справах культуры, які аб’ядноўвае дзяржаўныя і грамадскія інтарэсы ў гэтай сферы, прайшло ў старажытным Мірскім замку

**Адам Мальдзіс**

Упершыню ў замку мне давялося пабываць вясной 1993 года. Тады ў Мінску праходзіла Міжнародная канферэнцыя, прысвечаная беларуска-літоўскаму грамадска-культурнаму ўзаемадзеянню, і група яе ўдзельнікаў, у тым ліку і такія асобы, як мецэнат, нашчадак князёў Мсціслаўскіх і Заслаўскіх прафесар Анджэй Цеханавецкі (Англія), прадстаўнік Польшчы ў ЮНЕСКА прафесар Ежы Клачоўскі, прафесар Сантэ Грачыёці (Італія), выехала ў Нясвіж і Мір. Калі ў Нясвіжскім замку, дзе тады быў санаторый, мы пабачылі адносны парадак, то ў Мірскім… сустрэла запусценне. Нашы госці прыйшлі да высновы, што з такім каштоўным гісторыка-архітэктурным помнікам трэба нешта тэрмінова рабіць. Кожны з гасцей даў слова напісаць грунтоўны ліст ад сваёй, нацыянальнай камісіі ў ЮНЕСКА. Так і быў атрыманы першы грант на рэстаўрацыю Мірскага замка.

Аднак неўзабаве рэстаўратары пабачылі, што і першага, і наступных грантаў, і грамадскай дапамогі замала. За іх удалося больш-менш прывесці ў парадак толькі адну вежу ды пераходы да яе. І тады пра замак пачала клапаціцца дзяржава. Актывізавалася Міністэрства культуры. Экспанаты, абсталяванне шматлікіх інтэр’ераў ўзяў на сябе Нацыянальны мастацкі музей. У выніку замак, які выбудавалі ў XV стагоддзі князі Ільнічы, а потым дараблялі і пераробілі Радзівілы і Святаполк-Мірскія, на пачатку 2011-га ажыў нанава. На ўрачыстым адкрыцці яго першай і асноўнай часткі прысутнічаў Прэзідэнт.

ЮРЫЙ ІВАНОЎ

Удзельнікі пасяджэння Савета пад час экскурсіі па Мірскім замку

І вось адноўлены замак пачаў сплачваць беларускай дзяржаве і грамадству свой доўг — укладзеныя ў яго сродкі. У старажытных сценах, якія памятаюць не адну каранаваную асобу і не аднаго вяльможу, адбыўся першы грамадскі форум, куды больш дэмакратычны па складзе ўдзельнікаў — гэта былі артысты, мастакі, пісьменнікі, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы. Тут прайшло першае пасяджэнне Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Беларусі.

Пасяджэнню папярэднічала экскурсія па адноўленым замку. Мы змаглі пераканацца, як многа рэчаў знойдзена або адноўлена па старых узорах. І ўжо цяпер у Мір прыязджае куды больш турыстаў, айчынных і замежных, паляпшаецца іх абслуга.

Пасяджэнне адкрыў старшыня Грамадскага савета міністр культуры Павел Латушка. Ён пазнаёміў прысутных з пастановай Савета Міністраў аб стварэнні савета і палажэннем аб прынцыпах яго работы, складам савета, куды ўвайшлі кіраўнікі ўсіх творчых саюзаў і многіх грамадскіх аб’яднанняў, вядомыя дзеячы культуры, навукі і мастацтва. Асноўныя пытанні будуць спярша кваліфікавана разглядацца ў секцыях. Іх сем, у адпаведнасці з кірункамі: тэатральная, выяўленчая, музычная, харэаграфічная і цыркавога мастацтва, кінамастацтва і тэлебачання, ахова гісторыка-культурнай спадчыны і музейнай дзейнасці (мяне ўключылі ў яе склад), сфера адукацыі, бібліятэчная справа і культурная дзейнасць.

З дакладамі і ў спрэчках выступілі рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва Барыс Святлоў, намеснік старшыні Грамадскага савета Анатоль Бутэвіч, старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч, старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны Алег Трусаў і іншыя. Яны ўзнімалі пытанні рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, недахопу ў рэпертуарах тэатраў твораў айчыннай драматургіі і шэраг іншых. Мне выпала сказаць пра тое, што, належным чынам ацаніўшы ўклад у нашу культуру роду Радзівілаў, мы амаль забылі пра музейную, бібліятэчную і архіўную дзейнасць іншых магнатаў і мецэнатаў, у першую чаргу Сапегаў, чыю багатую карцінную галерэю ў Ружанах і Дзярэчыне можна было б аднавіць адносна лёгка і з вялікай карысцю.

Прынята рашэнне праводзіць пасяджэнні савета два разы на год, бліжэйшыя будуць прысвечаны мастацкаму выхаванню моладзі і захаванню гістарычнай спадчыны.

СПАДЧЫНА

# Дом на плошчы Свабоды

## Сядзібу XVIII стагоддзя ў цэнтры Мінска адрэстаўруюць для твораў мастацтва

**Віктар Корбут**

Галерэю народнага мастака Беларусі Міхаіла Савіцкага плануюць адкрыць на мінскай плошчы Свабоды ў наступным годзе. Для гэтага выбраны асаблівы будынак — адзін з найстаражытнейшых у гэтым раёне, колішні шляхецкі палац. На жаль, сам майстар ужо не зможа ўдзельнічаць у адкрыцці свайго “палаца мастацтва”. Летась ён памёр. Але пры яго жыцці часовая галерэя была побач — на вуліцы Рэвалюцыйнай, у адноўленых будынках XIX стагоддзя. А ў палацы, дзе размесціцца сталая экспазіцыя, цяпер шчыруюць рабочыя. Тут вядзецца маштабная рэканструкцыя. Будаўнікам трэба ўмацаваць сцены і падмурак старога будынка. Дырэктар камунальнага ўнітарнага прадпрыемства “Мінская спадчына" Павел Шыкунец, які кіруе працэсам, мяркуе, што ўсе работы ў будучай галерэі скончацца ўжо сёлета. Аздабленнем інтэр'ераў спецыялісты зоймуцца ў 2012 годзе.

Цікавая гісторыя будынка. Некалькі год таму там збіраліся размясціць музей гісторыі Мінска. І для гэтага былі пэўныя падставы. Паводле Уладзіміра Дзянісава, галоўнага архівіста Нацыянальнага гістарычнага архіва, дом №15 на плошчы Свабоды вядомы з сярэдзіны XVIII стагоддзя — тады ён упершыню быў згаданы як камяніца графаў Пшаздзецкіх, колішніх уласнікаў Заслаўя. Пазней палац набыў мінскі шляхціц Андрэй Станкевіч, і адкрыў побач адну з першых у горадзе аптэк, цяпер гэта будынак па вуліцы Рэвалюцыйнай, 2. У першай палове XIX стагоддзя дом перайшоў ва ўласнасць Юрыя Кабылінскага, сакратара Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу, сябра пісьменніка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Кабылінскі заснаваў у палацы першы ў горадзе музей. Дарэчы, у кунсткамеры захоўваліся не толькі прадметы беларускай даўніны. → Стар. 4

### У фокусе

■ **Моц роднага слова**
Суайчыннікі з-за мяжы маюць магчымасць пабываць на курсах беларускай мовы ў Мінску Стар. 2

■ **Скутэры ў дапамогу**
У Мінскай вобласці сацыяльныя работнікі змогуць выкарыстоўваць новы від транспарту Стар. 2

■ **З Палесся — у вялікі свет**
У Нацыянальнай бібліятэцы працуе выстава, прысвечаная 90-м угодкам Івана Мележа Стар. 4

■ **Музам хораша ў Нясвіжы**
Вечары беларускай оперы і балета пройдуць ля сценаў замка Радзівілаў Стар. 4

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# Згода пачынаецца з сям'і

Усім, пэўна, знаёмы мудры выраз, што шчасце — як здароўе: калі яго не заўважаеш, значыць, яно ёсць. Падаецца, што сёння, калі ў розных краінах разгараюцца канфлікты на рэлігійнай ці нацыянальнай аснове, тое ж самае можна сказаць і пра грамадства: калі лад і згода ёсць — іх не заўважаем.

БЕЛТА

Прадстаўнікі розных этнасаў камфортна пачуваюць сябе ў беларускім культурным асяроддзі

Іван Ждановіч

Сацыёлагі навучыліся "замерваць" "узровень згоды" і сваімі метадамі. Скажам, на нядаўняй калегіі апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў прыводзіліся вынікі даследавання, праведзенага ў Гродне. Іх згадала намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Ірына Сенчанкава. Назваўшы свой горад "самым еўрапейскім у Беларусі", яна сказала і аб прадстаўніках больш чым 80 этнасаў, якія там пражываюць, і пра актыўную работу 15 нацыянальна-культурных аўтаномій, асабліва пад час падрыхтоўкі і правядзення ў Гродне ўжо традыцыйных Усебеларускіх фэстаў нацыянальных культур. Дык вось, жыхарам шматэтнічнага горада сацыёлагі задалі пытанне: ці адчувалі вы непаважлівае стаўленне да сябе з-за вашай нацыянальнай прыналежнасці на рабоце, у зносінах з сябрамі-таварышамі, у размовах на вуліцы? І пераважная большасць апытаных адзначылі, што ўвогуле ніколі не траплялі ў такія сітуацыі.

І Гродна — не выключэнне: пераважная большасць грамадзян Беларусі шануе правілы паважлівага, талерантнага стаўлення да людзей розных веравання і нацыянальнасцяў, якія спрадвеку склаліся на нашай зямлі. У дакладзе на калегіі Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Леанід Гуляка ўсебакова аналізаваў, як выконвалася пяцігадовая Праграма развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных дачыненняў і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой. Гаварыў пра тое, што лад і згода ў грамадстве — гэта і вялікая каштоўнасць, і аснова яго моцы, і неабходная ўмова для развіцця. Прыводзіў, у прыватнасці, такія факты, што сведчаць пра вельмі стракаты рэлігійна-этнічны склад насельніцтва. Цяпер у Беларусі зарэгістравана 3321 рэлігійная арганізацыя 25 канфесій, сярод вернікаў — хрысціяне розных кірункаў, іудзеі, мусульмане. Паводле дадзеных перапісу насельніцтва 2009 года 83,7 працэнта жыхароў краіны складаюць беларусы. Астатняе насельніцтва — гэта прадстаўнікі больш чым 140 нацыянальнасцяў, у тым ліку: 8,3 працэнта — рускія, 3,1 працэнта — палякі, 1,7 працэнта — украінцы і 0,1працэнта — яўрэі. Прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў менш за 10 тысяч.

У тонкай сферы нацыянальна-этнічных стасункаў шмат залежыць не толькі ад дзяржаўнай палітыкі, але і ад сям'і: ад таго, у якой атмасферы выхоўваюцца дзеці. Каштоўным вопытам правядзення духоўна-асветніцкай акцыі "Сям'я. Яднанне. Айчына" на калегіі падзялілася намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама Людміла Канановіч. Гэты вялікі "марафон дабрыні" ў раёне, дзе зарэгістравана 50 рэлігійных абшчын, ініцыявалі прадстаўнікі праваслаўнай царквы. У цесным кантакце з райвыканкамам энтузіясты правялі звыш сотні масавых мерапрыемстваў. На іх знайшлося месца і шчырым размовам аб праблемах сучасных сем'яў, якія былі і застаюцца люстэркам любога грамадства. Спецыялісты, вернікі давалі парады, як будаваць сямейныя стасункі па законах любові, каб малодшыя паважалі старэйшых, а дарослыя знаходзілі не непрыемнасці, а шчасце ў клопатах пра дзяцей. Па словах Людмілы Мікалаеўны, усю карысць ад марафона "Сям'я. Яднанне. Айчына" цяжка пераацаніць. У атмасферы любові, дабрыні, узаемапаразумення, лічыць яна, многія сацыяльныя праблемы знікнуць самі па сабе.

## Скутэры ў дапамогу

**У Мінскай вобласці сацыяльныя работнікі змогуць выкарыстоўваць новы від транспарту**

Як вядома, нямала пажылых людзей і інвалідаў жывуць у аддаленых ад райцэнтраў вёсках, і дабрацца туды бывае няпроста. А для іх жа трэба купляць прадукты, іншыя тавары, лекі і дастаўляць своечасова. Такіх падапечных у кожнага сацыяльнага работніка па некалькі. Можна, вядома, пакруціць педалі службовага веласіпеда, але ж на ім, напрыклад, у снежную зіму далёка не паедзеш. Выйсце знайшлі ў Мядзельскім райвыканкаме: там прапанавалі забяспечыць сацработнікаў больш сучасным і зручным відам транспорту — скутэрамі .

У Мінскім аблвыканкаме ініцыятыву падтрымалі. І палічылі, што тое ж трэба зрабіць і ў іншых рэгіёнах Міншчыны. Ужо прынята рашэнне набыць 12 скутэраў за лік сродкаў рэзервовага фонда.

Як вядома, у Беларусі штогод 5 студзеня адзначаецца Дзень работнікаў сацыяльнай абароны. Цяпер у сістэме Мінпрацы і сацыяльнай абароны дзейнічае 156 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання, дзе на ўліку — каля паўтара мільёна чалавек. Прычым аслугоўваннем на даму ахоплена больш за 75 тысяч пажылых і непрацаздольных грамадзян, у тым ліку ў сельскай мясцовасці — больш за 52 тысячы чалавек.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Моц роднага слова

## Суайчыннікі з-за мяжы маюць магчымасць наведаць курсы беларускай мовы, што ладзяцца на Радзіме

Іван Іванаў

Не раз заўважаў: пад час сустрэч на Бацькаўшчыне нашы землякі з замежжа, бывае, і хочуць загаварыць па-беларуску, ды не заўсёды атрымліваецца. А таму адразу ніякавеюць, губляюцца… То слоў родных ім не хапае, а найчасцей — проста моўнай практыкі. І было мне вельмі прыемна пачуць, як прыгожа, лёгка гаворыць па-беларуску госця з Расіі Зінаіда Іванаўна Карнавух. Родам яна з Валожынскага раёна Міншчыны, з вёскі Подбалаць. Вядома ж, і вясковае дзяцінства, а яшчэ 20 гадоў працы настаўніцай у беларускай школе, і восем гадоў дырэктарства — салідная аснова для таго, каб мова, як кажуць, зраслася з душой назаўсёды. Потым, кажа Зінаіда Іванаўна, лёс перакінуў яе ў Тальяці: там жылі ўсе сёстры, якія паехалі на волжскія новабудоўлі. "Між іншым, нас многа ў мамы, ажно васьмёра! — удакладняе зямлячка. — Паехала да іх, там і знайшла сваю долю. Больш за 15 гадоў у агульнаадукацыйнай школе-інтэрнаце працавала, дзе выхоўваліся дзеці з няпоўных і няўдалых сямей, потым, аж да пенсіі, — настаўніцай у звычайнай школе".

І вось аказалася, што беларуская мова спатрэбілася Зінаідзе Іванаўне і ў Тальяці. "Я ўжо гадоў дзесяць на грамадскіх пачатках працую ў тальяцінскай суполцы беларусаў "Нёман", цяпер уваходжу ў склад праўлення, — прадаўжае яна. — Доўгі час пела ў ансамблі "Купалінка", потым мы саступілі дарогу маладым. Цяпер пры суполцы склаўся яшчэ і ансамбль "Зорачкі": збіраем рэпертуар, настройваем юных артыстаў на хвалю беларускасці, усяляк падтрымліваем іх. Гэта ж так няпроста — і галасы "паставіць", і ўвогуле дзіцячую мову, каб яна прыгожа, натуральна гучала па-беларуску".

Далей Зінаіда Іванаўна загаварыла аб праблеме, характэрнай для многіх суполак замежжа: жывых носьбітаў беларускіх мовы ў Тальяці мала. "Толькі збоку здаецца, што мова беларуская падобная да рускай, — лічыць былая настаўніца. — А вось паспрабуй, загавары сам па-беларуску! Без спецыяльных заняткаў мала каму гэта ўдаецца, асабліва калі няма штодзённай моўнай практыкі. Таму мая парада ўсім: гаварыце па-беларуску пастаянна, дзе б ні былі. Без ужытку мова выветрываецца".

Тым больш заслугоўвае павагі, што Зінаіда Карнавух, нягледзячы на пенсійны ўзрост, з ахвотай павучылася ў Мінску на курсах беларускай мовы. Для тых, каго, можа, натхніць яе прыклад, удакладніла: гэта былі двухтыднёвыя курсы для настаўнікаў Беларусі ў Акадэміі паслядыпломнай перападрыхтоўкі настаўнікаў. Удасканальвала ж родную мову Зінаіда Іванаўна для мэт высакародных: суполка ў Тальяці збіраецца арганізаваць нядзельны клас для беларускіх дзяцей, і яна будзе там настаўніцай.

АЛЯКСАНДР РУЖАЧКА

Родная мова ў жыццёвай дарозе ніколі не будзе залішняй

"Да нас паступаюць звесткі, што цяпер ствараюцца нядзельныя школы для беларускіх дзяцей у Кішынёве, Тальяці, Новасібірску, іншых гарадах замежжа, — гаворыць супрацоўніца таварыства "Радзіма" Галіна Навіцкая. — І вельмі добра, што ў тальяцінскай суполцы "Нёман" разумеюць: каб добра вучыць — трэба і самім павучыцца. Безумоўна, моўныя курсы, асабліва для тых, хто вядзе там заняткі, вельмі патрэбныя. У прыватнасці, і таму, што з верасня пачалася рэформа беларускага правапісу. Мы гатовы аказваць падтрымку тым, хто хоча пабываць на моўных курсах на Бацькаўшчыне. Спадзяюся, з часам яны стануць запатрабаванымі, можна будзе праводзіць іх для беларусаў замежжа пастаянна".

**Дарэчы.** Міжнародны дзень роднай мовы ў свеце па традыцыі будзе праводзіцца 21 лютага. З гэтай нагоды і ў Беларусі пройдзе шэраг розных мерапрыемстваў. У прыватнасці, Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны выступіла з ініцыятывай правесці VI агульнанацыянальны дыктант па творах Максіма Багдановіча: сёлета 120-я ўгодкі паэта-класіка. У многіх школах краіны ўжо рыхтуюцца да дыктанта.

# Круг вялікі, круг малы…

## Таленавітыя родзічы і нашчадкі вядомага беларускага кампазітара Мікалая Аладава жывуць у Мінску, Маскве, Санкт-Пецярбургу

Мікалай і Алена Аладавы з унукамі Андрэем і Вадзімам. 1968 г.

Іна Ганчаровіч

Летась на дзіцячым "Еўрабачанні" спявак Даніла Казлоў прадстаўляў Беларусь, разам з ім выступаў Ян Аладаў. Нядаўна я даведалася, што Ян — праўнук знакамітых людзей: кампазітара Мікалая Ільіча Аладава і ягонай жонкі Алены Васільеўны. А гэта былі яркія прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі мінулага стагоддзя: прафесар, першы пасляваенны дырэктар Беларускай кансерваторыі і стваральніца цяперашняй калекцыі Мастацкага музея.

Мне захацелася больш даведацца пра гэтых людзей, іх нашчадкаў. І вось я ў гасцях у Радаславы Аладавай. Яна кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі — пайшла па бацькавай лініі. Гутарым з ёй у той жа ўтульнай гасцінай, дзе ў пасляваенныя гады перабывалі многія дзеячы беларускай музычнай культуры, мастацтва. На высокім серванце — прыгожы бюст былога гаспадара кватэры, Мікалая Аладава, работы скульптара Заіра Азгура: яны былі добрымі сябрамі. З вокнаў кватэры відаць будынак Купалаўскага тэатра. Пакой прасторны, абстаўлены ў строгім класічным стылі. "У шаноўных гадах бацька хацеў бачыць побач рэчы ранейшых гадоў, — расказвае Радаслава Мікалаеўна. — І мама паспрабавала ўзнавіць тую атмасферу".

А яшчэ мяне ўразіла, як хораша вяла наш няспешны дыялог гаспадыня: уважліва слухала, прыгожа, ёмка і, я б сказала, арыстакратычна гаварыла: такі вытанчаны моўны лад сустрэнеш цяпер хіба ў дарэвалюцыйных раманах… Радаслава Мікалаеўна, па ўсім бачна, ганарыцца бацькамі, якія здолелі і ярка праявіцца ў соцыуме, і хораша зладзіць сямейнае жыццё: "Яны былі вельмі розныя, але выдатна дапаўнялі адзін другога. Бацька быў прынцыповым і досыць упартым чалавекам, а маці заўсёды ўмела мякка гэтак абысці, пазгладжваць усе непрыемнасці, калі яны здараліся. Агульнае ж, мабыць, у іх было адно: яны былі незвычайна добрыя".

Мікалай Ільіч Аладаў, прафесар, народны артыст Беларусі, вядомы не толькі як адзін з заснавальнікаў сімфанічнага, кантатнага і шэрагу іншых жанраў беларускай музыкі. Ён яшчэ і родапачынальнік музычнай дынастыі. Нарадзіўся 21 снежня 1890 года, і летась 120-я ўгодкі класіка адзначаліся ў краіне. А родам кампазітар з Санкт-Пецярбурга, з арыстакратычнай сям'і. Цікавы факт, які раней не афішаваўся: Мікалай Ільіч жыў на Сярэднім праспекце Васільеўскага вострава якраз у тым двухпавярховым доме нумар 24, які і сёння вядомы як помнік архітэктуры пад назвай Дом Аладава. Менавіта ў ім, дарэчы, у канцы 1830-х гадоў жыў выдатны рускі мастак Аляксей Венецыянаў. Як гаворыць Радаслава Мікалаеўна, яе пецярбургскі дзядуля, Ілья Сямёнавіч, быў у дваранскай супольнасці чалавекам паважаным, з залатым медалём скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт і абараніў дысертацыю па тэорыі бясконца малых велічыняў. А бабуля, Ганна Іванаўна, была "чалавекам дома".

Карціна "Кампазітар Мікалай Аладаў" Івана Ахрэмчыка. 1961 г.

Ян Аладаў

"У сям'і гадавалася чацвёра дзяцей, — расказвае Р.Аладава. — Мая вельмі адукаваная цётка Маргарыта, а таксама дзядзька Міхаіл, чырвоны камандзір, загінулі ў войнах. Андрэй Ільіч, маскоўскі дзядзечка, якога я добра ведала і памятаю, стаў матэматыкам і стварыў "малы круг Аладавых" у Маскве.

А вялікі родавы круг у Мінску, варта дадаць, распачаў Мікалай Аладаў, яе бацька. Адкуль жа ў яго "музычныя гены"? Паводле сямейнага падання, яшчэ прадзед бацькі Мікалая Ільіча ажаніўся з А. Глазуновой, з роду рускага кампазітара Аляксандра Глазунова. Але, як лічыць Радаслава, яе бацьку "музычныя здольнасці перадаліся, хутчэй за ўсё, ад маці: яна была вельмі музычнай жанчынай".

Жыць, працаваць у Мінск Мікалай Аладаў пераехаў у 1924 годзе: у сталіцы ў працяг ранейшых музычных традыцый (яшчэ ў 1803 годзе ў Менску быў арганізаваны гарадскі аркестр!) адкрываўся Беларускі музычны тэхнікум, і прафесіяналаў збіралі з розных гарадоў Саюза. Першы дырэктар Белмузтэхнікума Аркадзь Бяссмертны пазней згадваў з гумарам, як у Маскве, у Дзяржаўным інстытуце музычнай культуры ён пабачыў маладога чалавека ў чырвонай касаваротцы і падумаў: ну ўжо гэтага я ніяк не вазьму! Ды аказалася, што гэта якраз "той самы Аладаў", пра якога яму гаварылі як пра доку, які не раз бываў у Беларусі і добра ведае беларускі фальклор. "Бацька і сапраўды быў надзвычай арыгінальным чалавекам, што і адрознівала яго ад многіх, — з добрай усмешкай прыгадвае субяседніца. — Вельмі ліберальны па натуры, ён мог сабе шмат дазволіць. Напрыклад, хадзіў заўсёды ў Бог ведама якім, вельмі кідкім адзенні. І аднойчы, адпачываючы ў прынарачанскай вёсцы, сваім выглядам вельмі здзівіў і нават напалохаў мясцовых жыхароў, якія прынялі вусатага дзядзьку за цыгана".

Знаёмства ж Мікалая Ільіча і Алены Васільеўны адбылося ў Парычах у 1928 годзе. У прыгожым мястэчку на рацэ Бярэзіне (цяпер — Светлагорскі раён Гомельшчыны) у той час жыло шмат таленавітых маладых людзей, якія з часам сталі вядомымі ў нашай культуры, мастацтве. Аладаў быў у складзе чарговай фальклорнай экспедыцыі, яна праводзілася па ініцыятыве Інстытута беларускай культуры. Разам з Язэпам Лёсікам, беларускім пісьменнікам і лінгвістам — ён пазней быў рэпрэсаваны — яны заехалі ў хату сельскіх настаўнікаў, якая славілася гасцінна-

Алена Аладава

цю і багатым сталом. Там упершыню і назаўжды сустрэліся Аладавы. На той час Алена Васільеўна ўжо скончыла Беларускі дзяржуніверсітэт і была, як сцвярджае яе дачка, "вельмі жывой, сучаснай і нацыянальна арыентаванай дзяўчынай".

Так што Алена Васільеўна Аладава — карэнная беларуска. Нарадзілася 22 мая 1907 года ў Пружанах, на Берасцейшчыне, у моцнай настаўніцкай сям'і. Дарэчы, у 2007-м у гонар яе 100-х угодкаў там, на сцяне архітэктурнага помніка сярэдзіны XIX стагоддзя музея-сядзібы "Пружанскі палацык", урачыста адкрыта памятная дошка, Бацька, Васіль Ісаевіч Пук, родам з Гарадзеншчыны, з 1902 года настаўнічаў спачатку ў сядзібах Ковенскай губерні, з 1904 года — у школе ў Пружанах. Там і пазнаёміўся, ажаніўся з настаўніцай Аленай Сільвестраўнай Карпызавай. У беларускіх настаўнікаў, як і ў іх піцерскіх сватоў, таксама было чацвёра дзяцей. Алена, іх першая дачка, па сямейнай традыцыі выбрала педагогіку, закончыла ўніверсітэцкі педфакультэт. Пад час вучобы падпрацоўвала ў Беларускім дзяржаўным музеі ў якасці ілюстратара, наведвала вячэрнюю ізастудыю пры Доме мастака. Так пачалося яе знаёмства з мастакамі, сур'ёзнае захапленне выяўленчым мастацтвам.

У сям'і Мікалая і Алены Аладавых нарадзілася трое дзяцей: спачатку, да вайны, Вальмен (1930) і Гельмір (1933). А Радаслава, жартуе, "пабачыла свет у прамежку паміж беганінай маёй мамы па міністэрствах" пад пераможныя залпы Вялікай Айчыннай вайны. І адкуль у дзяцей такія незвычайныя імёны? "У майго бацькі быў выдатны сябар Юльян Дрэйзін — музыказнаўца, перакладчык, які выкладаў ва ўніверсітэце старажытнагрэчаскую і лацінскую мовы і адначасова доўгі час быў скрыпачом сімфанічнага аркестра, — удакладняе Радаслава, — і ён з вельмі вялікай радасцю вынаходзіў нам імёны. Вальмен азначае мудры чалавек, Гельмір — ад бога Сонца, Геліяса, і міру. А Радаслава — гэта бацькоўская радасць і слава. Усе мы гадаваліся досыць музычнымі дзецьмі, вучыліся ў музычнай школе, ды па слядах бацькі пайшла я адна, а браты — больш па мамінай лініі".

Вальмен Аладаў закончыў Маскоўскі архітэктурны інстытут, доўгі час узначальваў праектны інстытут "Белгіпрагандаль", доктар навук. Ён аўтар больш чым сотні ўвасобленых архітэктурных праектаў, у тым ліку спартыўнага комплексу ў Раўбічах, вялікага сферычнага будынка Камароўскага рынку, універсамаў "Цэнтральны", "Фрунзенскі", "Серабранка"... У Вальмена Мікалаевіча двое сыноў. Андрэй, якога ў родзе завуць "бунтуючым дзіцем", стаў фізікам-лазершчыкам, жыве і працуе ў Санкт-Пецярбургу, у яго тры дачкі. Адна з іх, дарэчы, пайшла па прабабулінай лініі: выдатны рэстаўратар, вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным акадэмічным інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І.Рэпіна (гэта — на тым жа Васільеўскім востраве, непадалёку і Дом Аладава) на факультэце мастацтвазнаўства. Другі сын Вальмена Мікалаевіча, Вадзім, — мастак, жыве і працуе ў Германіі.

Гельмір Аладаў звязаў жыццё з тэатрам. У Маскве закончыў знакаміты ГИТИС, стаў акцёрам, працаваў у тэатрах Іркуцка, Таджыкістана. Потым вярнуўся ў Мінск, адпрацаваў дваццаць гадоў на кафедры рэжысуры масавых відовішчаў у Інстытуце культуры. Кажуць, студэнты яго проста абагаўлялі. У Мінску ў Гельміра нарадзілася дачка Ганна, якая, напэўна, пераняла "музычныя гены" дзеда: яна музыкавед і… джазвумэн, добра вядомая ў джазавых колах як выдатны імправізатар, была і журналісткай, вядучай тэлеперадач. Да таго ж яна і мама Яна Аладава, з якога, уласна кажучы, і пачаліся гэтыя нататкі. Цяпер праўнуку Мікалая Ільіча, які "засвяціўся" на мінскім "Еўрабачанні", дванаццаць гадоў, з шасці ён вучыцца ў Гімназіі-каледжы мастацтваў імя І.Ахрэмчыка на фартэпіянным аддзяленні. Як гаворыць Радаслава Мікалаеўна, Ян вельмі здольны, пачынае пісаць музыку, асвоіў шмат музычных інструментаў.

Як складзецца жыццё самага маладога з прадстаўнікоў мінскага, вялікага круга роду Аладавых? Родзічы спадзяюцца, што музыка стане галоўнай справай яго жыцця.

**Дарэчы.** Адна з вуліц мінскага мікрараёна Дамброўка, на захадзе сталіцы, у 2007 годзе названа зборным імем Аладавых — у гонар мастацтвазнаўца Алены Аладавай, кампазітара Мікалая Аладава і іншых дзеячаў (музыказнавец, архітэктар), якія выйшлі з гэтай таленавітай сям'і.

СЯДЗІБА І ГАСПАДАРЫ

# Хто ў цераме жыве?

На падворку Генадзя Пузанкевіча з Жодзіна цэлы заапарк: разгульваюць вясёлкавыя фазаны, рознакаляровыя дэкаратыўныя куры, пасвіствае, седзячы на кусце, вялікі зялёны папугай. Гулліва скача па вальеры, бы шчаня, сонечна-рыжая лісіца. Пухнатае ваверчаня Чып даверліва бярэ семкі з рук…

Людміла Мінкевіч

ЛЮДМІЛА МІНКЕВІЧ

У доме Генадзя Пузанкевіча можна пабачыць мноства птушак і жывёл

Заходзім у дом — вялікі, драўляны, увесь упрыгожаны разьбой, спраектаваны і пабудаваны гаспадаром. Кожны пакой — як казка, ці экспазіцыя музея, ці кавалак Белавежскай пушчы… Вось стаіўся ў зеляніне лебедзь, прыціхлі ў кутку бусел і чапля, прыселі на галінку вялікая і малая совы. А там як зляцеліся з усяго свету на белае палатно сотні разнакаляровых матылёў. Уражвае арлан-белахвост: распастрыў шырачэзныя крылы, пагрозліва падняў кіпцюрастую лапу. А побач — буры мядзведзь… "Церамок мой немалы, — смяецца Генадзь, — змясціў больш за трыста відаў птушак і жывёл, вялікіх і малых". На падворку — віруе жыццё, а гэтыя істоты замерлі, не падаюць ніякіх гукаў, хоць і выглядаюць як жывыя. Гэта чучалы, якімі Пузанкевіч займаецца больш за трыццаць гадоў.

Колькі сябе памятае, Генадзь Пузанкевіч цікавіўся прыродай. Па некалькі тыдняў у лесе прападаў: назіраў за птушкамі і жывёламі, рабіў замалёўкі, фотаздымкі. Неяк знайшоў забітых качак, нядбайна кінутых паляўнічымі на беразе возера. "Ці ж можна, — уразіўся хлопчык, — знішчаць прыгажосць дзеля забавы?" Вырашыў даць птушкам другое жыццё. Як? "Метадам спроб і здагадак… — уздыхае Генадзь. — Кніг па таксідэрміі было не дастаць. Настаўніца біялогіі параіла, як здымаць з птушак і жывёл скуркі: ведала пра тое з універсітэта, астатняе дадумваў сам".

Хоць сёння з кнігамі, "хіміяй" праблем няма, аднак, як і раней, мастакоў-таксідэрмістаў па Беларусі — адзінкі. Бо нялёгкая гэта справа: і біялогію трэба ведаць, і цярпенне мець, і добры мастацкі густ. Многія напрошваліся ў вучні да Генадзя, а толькі адзін застаўся ў гэтым рамястве, ды сын Віктар часам робіць чучалы дзікоў. А самога Пузанкевіча як чучальніка і супрацоўніка Жодзінскага краязнаўчага музея добра ведаюць і ў Беларусі, і за мяжой. Яго работы выстаўляюцца ў розных гарадах краіны і ў Прыбалтыцы. Эксурсіі гаспадар праводзіць і дома: для школьнікаў, асобных турыстаў. У багатай калекцыі чучалаў ёсць нават унікальныя экзэмпляры. Тлумачу: Пузанкевічу прыносяць птушак і жывёл, забітых аўтамабілямі ці электратокам, загінулых ў заапарку ці лютай зімой. Дзеляцца трафеямі паляўнічыя. І ляснічыя часам просяць даць другое жыццё істотам, адабраным у браканьераў.

На сядзібу Пузанкевічаў, як да доктара Айбаліта, прыносяць і падбітых ці скалечаных лясных жыхароў. І Генадзь разам з жонкай, галоўнай памагатай, даглядае, выходжвае малых. Скажам, Чып трапіў да іх яшчэ голенькім і сляпым: гняздо вавёркі няўзнак разбурылі пры валцы лесу. Кармілі па кропельцы з піпеткі, а сёння прыгожы Чып на радасць гасцям спрытна грызе семкі і арэхі. Былі на падворку лісы, казуля, розныя птушкі. Пузанкевічы вызначаюць памеры, пол, характар харчавання істот і адсылаюць звесткі ў акадэмічны Інстытут заалогіі. Гэта карысныя звесткі для напісання артыкулаў, кніг. Ведаюць у Беларусі і фотаздымкі Генадзя Пузанкевіча. Што здымае? Усё тое ж, без чаго не ўяўляе жыццё: прыроду, жывёл, птушак… Неяк за падорлікам фотапаляваў аж два тыдні, амаль не злазячы з дрэва, пакуль не зняў тое, што хацеў.

Яшчэ адно хобі Генадзя Пузанкевіча — падарожжы. Ён з жонкай ужо перасек экватар, яны бачылі прыгажосць трапічнага дажджавога лесу. Генадзь узышоў на самую высокую гару Малайзіі (больш за 4 тысячы метраў), зрабіў шмат здымкаў пад час фотасафары ў Афрыцы… Дома гаспадары вырошчваюць лімоны і апельсіны, мандарыны і грэйпфруты, у садзе прывілі на рабіне грушу, а на "дрэве дружбы" — адразу 15 гатункаў яблыкаў! З Далёкага Усходу Генадзь прывёз каля 30 кілаграмаў кедравых арэхаў, здабытых уласнаручна, — проста для таго, каб раслі кедры на роднай яму жодзінскай зямлі.

СПАДЧЫНА

# Дом на плошчы Свабоды

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Як пісаў у мемуарах адзін з віленскіх генерал-губернатараў, які наведваў сядзібу, у Кабылінскага ён бачыў нават карту часоў Хрыстафора Калумба. Калекцыя, праўда, пасля смерці ўладальніка трапіла ў Віленскі музей старажытнасцяў, заснаваны братамі Яўстафіем і Канстанцінам Тышкевічамі. І, мабыць, прадметы з першага мінскага музея цяпер трэба шукаць у зборы Нацыянальнага музея Літвы, мяркуе спадар Дзянісаў.

У 20-я гады у колішнім палацы размяшчалася Тэрміналагічная камісія — папярэдніца Інстытута беларускай культуры і Нацыянальнай акадэміі навук.

На жаль, у час рэканструкцыі страчана барочная лесвіца, якая вяла на другі паверх. Па шырокіх сходах пад нізкай столлю яшчэ ўвесну 2009 года я меў магчымасць падняцца на другі паверх дома. Як сведчыць Уладзімір Дзянісаў, тут, у параднай зале, даследчыкі знайшлі сляды манументальнага жывапісу. А ў Нацыянальным гістарычным архіве захоўваюцца дакументы, якія

Цяпер у гэтым будынку ідзе рэстаўрацыя

пацвярджаюць, што памяшканні сапраўды былі размаляваны. Больш за тое, гэтыя ж архіўныя паперы дазваляюць аднавіць дэталі першапачатковага інтэр'ера.

Як бачым, і старажытны будынак, і ягонае культурнае асяроддзе — усё гэта як каштоўны помнік гісторыі Мінска, сапраўдны палац мастацтва з моманту яго заснавання. Пасля поўнага аднаўлення дом на плошчы Свабоды, несумненна, стане яшчэ адным цэнтрам прыцягнення турыстаў.

# З Палесся — у вялікі свет

**У Нацыянальнай бібліятэцы працуе выстава, прысвечаная 90-м угодкам Івана Мележа**

На выставе "Спявак палескага краю" экспануюцца больш за 270 розных дакументаў, якія знаёмяць з багатай творчай спадчынай пісьменніка — яго раманамі, аповесцямі, а таксама крытычнымі працамі, дзённікамі, п'есамі. Як вядома, яркай вяршыняй творчасці пісьменніка Івана Мележа (1921—1976) па праву лічыцца трылогія "Палеская хроніка". Яна ўключае раманы "Людзі на балоце" (1961), "Подых навальніцы" (1964) і "Завеі, снежань" (1976, не закончаны). Выклікае захапленне ў чытачоў розных краін тое, як таленавіта аўтар паказаў непаўторнасць прыроды палескага краю, характары палешукоў, адлюстраваў драматызм сацыяльна-грамадскіх працэсаў даваеннай пары. Раманы вывучаюцца ў школе. Шырокае прызнанне атрымаў і раман "Мінскі напрамак"(1952) — адзін з першых у айчыннай літаратуры панарамны твор, прысвечаны вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

На выставе асобна прадстаўлены творы Івана Мележа ў перакладах на рускую, англійскую, украінскую, балгарскую, іспанскую і іншыя мовы. Раздзел "Мастацкае жыццё твораў пісьменніка" — гэта артыкулы пра мастацкія фільмы і спектаклі, пастаўленыя па мележаўскіх творах.

# Музам хораша ў Нясвіжы

**Вечары беларускай оперы і балета пройдуць ля сценаў замка Радзівілаў**

Выступленні запланаваны на канец чэрвеня, праграма вечароў цяпер удакладняецца.

Праект "Вечары беларускай оперы і балета ў замку Радзівілаў" дэбютаваў летась. Прама пад адкрытым небам для гледачоў зладзілі каля тысячы месцаў. Усім спадабалася і акустыка: ніводнага мікрафона не спатрэбілася. У праграме прэм'ерных вечароў, нагадаем, былі опера "Чужое багацце нікому не служыць", балет "Шапенія" і гала-канцэрт.

Верагодна, што сёлета ў Нясвіжы гледачы змогуць убачыць як беларускія спектаклі, так і замежныя пастаноўкі. Справа ў тым, што летам Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета плануе правесці ў Мінску першы форум балетнага мастацтва. Ён, як мяркуецца, будзе доўжыцца каля двух тыдняў, і ўжо ёсць дамоўленасць з тэатрамі з Грузіі, Украіны, Расіі.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1960
Заказ: 169
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2011